*Доўнар Аляксандр Андрэевіч,*

*студэнт юрыдычнага факультэта БДУ*

## ПЕРАЕМНАСЦЬ У ГІСТАРЫЧНЫМ РАЗВІЦЦІ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАВА БЕЛАРУСІ

У самых старажытных айчынных законах (княжацкіх уставах, Рускай Праўдзе, міжнародных дагаворах і інш.) гаварылася аб злачынстве і пакаранні. У той перыяд, калі беларускія землі сталі палітыка-эканамічным цэнтрам Вялікага Княства Літоўскага, падставай для распрацоўкі агульнадзяржаўнага крымінальнага права і афармлення яго ў асобную галіну права стала звычаёвае права старажытных беларускіх княстваў і новае пісанае заканадаўства. Грамата Казіміра 1447 г. упершыню ў адносінах да крымінальнага правапарушэння выкарыстала амаль што сучасны тэрмін “праступка”, г.зн. засяродзіла ўвагу на яго проціпраўнасці [1, с.42]. Першы кадыфікаваны крымінальны закон – Судзебнік 1468 г. паўтарыў гэты тэрмін, развіў ідэю індывідуалізацыі адказнасці, зрабіў спробу абмежаваць узрост крымінальнай адказнасці, а ўвогуле выразна паказаў новы погляд на злачынства і пакаранне [1, с. 110].

Палажэнні Судзебніка былі значна развіты ў XVI ст. Асабліва гэта тычыцца Статутаў 1529, 1566 і 1588 гадоў, у якіх былі замацаваны самыя прагрэсіўныя прававыя прынцыпы ў сферы крымінальнага права: законнасць і справядлівасць, прэзумпцыя невінаватасці, адказнасць кожнай асобы за ўласную віну і ў судовым парадку і інш. Асабліва важным было тое, што заканадаўца ўпершыню зрабіў спробу тэарэтычнага фармулявання паняцця прэзумпцыі невінаватасці, хоць гэтыя палажэнні Статута 1566 года тычыліся толькі саслоўя шляхты. Статутныя нормы адлюстравалі і значны гуманізм тагачаснага крымінальнага закона.

Хоць статутныя нормы не ўтрымліваюць дэфініцыі злачынства, але з іх аналізу можна зрабіць вывад, што заканадаўца лічыць злачынствам супрацьпраўнае, віноўнае дзеянне, якое ўключае ў сябе элемент грамадскай небяспекі і робіць замах на грамадскі лад, правапарадак, уласнасць, асобу, яе правы і інтарэсы [2, с.135]. Таксама крымінальны закон ужо ў XVI ст. адрознівае складовыя часткі злачынства і даволі выразна апісвае істотныя і тыповыя прыкметы злачынства. Аб’ектам злачынства прызнаюцца канкрэтныя даброты і інтарэсы асоб, а Статут 1588 г. прызнае аб’ектам і злачынны замах на адносіны па падтрыманню грамадскага парадку і грамадскай маральнасці. Як адзначаюць даследчыкі, ён гаворыць і аб двухаб’ектных злачынных дзеяннях [2, с.136]. Так, пры замаху на жыццё асобы, якая мела ахоўную грамату вялікага князя, аб’ектам лічылася не толькі жыццё чалавека, але і парушэнне княжацкай «уставы» [3, р. 1, арт. 13]. Шмат увагі надаваў закон прыкметам, якія характарызуюць злачынства ў яго знешнім праяўленні: самому дзеянню, якое магло мець формы актыўных дзеянняў чалавека і ўстрымання ад пэўных дзеянняў (злачынная бяздзейнасць), а таксама прычыннай сувязі паміж дзеяннем і наступствамі, месцу, спосабу, часу і абставінам здзяйснення злачынства.

Суб’ектам злачынства прызнаваўся толькі чалавек, які дасягнуў пэўнага ўзросту і быў у стане наяўнасці свядомасці. Упершыню ў Статуце 1566 года быў вызначаны ўзрост крымінальнай адказнасці асобы – з 14 гадоў [4, р.XIV, арт.8]. Як правіла, псіхічна хворыя не падлягалі крымінальнай адказнасці, прычым заканадаўца ўсведамляў медыцынскі крытэрый свядомасці, бо адрозніваў «дурняў» і «шалёных, которые за допущением Божьим от розуму отошедши». Менавіта заканадаўчая рэгламентацыя ў Статутах гэтых палажэнняў сведчыць аб прынцыпу гістарычнай пераемнасці ў сферы крымінальнага заканадаўства, бо нават у

крымінальных кодэксах савецкага перыяду заканадаўца прытрымліваўся аналагічнай пазіцыі.

Шмат увагі закон XVI ст. надаваў усім важнейшым інстытутам крымінальнага права, у тым ліку інстытуту неабходнай абароны і крайняй неабходнасці. Крайняя неабходнасць, як акалічнасць, якая выключала злачынны характар дзеяння і яго каральнасць, прызнаецца Статутам 1588 г. у двух выпадках: пры здачы крэпасці непрыяцелю па прычыне голаду «гвалтовного» і пры забойстве чужога сабакі пры абароне ад яго нападу, аднак таксама заканадаўца гаворыць аб некаторых удакладняючых абставінах пры разглядзе такіх спраў (3, р. I, арт. 3; р. XIII, арт. 13).

У Статутах мы бачым ужо выразную, хаця яшчэ і не зусім дасканалую, класіфікацыю злачынных дзеянняў, якая грунтавалася галоўным чынам на аб’екце злачыннага замаху. Так, самыя цяжкія дзяржаўныя злачынствы размешчаны ў Статуце 1588 г. у асноўным у першым раздзеле («О персоне нашей господарской»); злачынствы маёмасныя і супраць асобы сканцэнтраваны галоўным чынам у адзінадцатым раздзеле («О гвалтеях, о боех, о головшизнах шляхецких»); назва чатырнаццатага раздзела адпавядае яго зместу («О злодействе всякого стану»); злачынствы супраць правасуддзя змешчаны ў чацвёртым раздзеле («О судьях и о судах»); воінскія злачынствы – у другім раздзеле («О обороне земской») і г. д. Аднак, разам з аднароднымі злачынствамі сустракаюцца і такія, што ўключаны ў пэўны раздзел на падставе зусім выпадковых прыкмет.

Нягледзячы на выкарыстанне розных тэрмінаў для абазначэння пакарання («каранье», «скаранье», «покута», «казнь» і інш.), у Статуце 1566 года, а асабліва ў Статуце 1588 года, ужо яўна бачна разуменне злачынства як грамадскага зла, а пакарання – не толькі як публічнай і застрашваючай кары за гэтае зло, але і падставы для папярэджванне

злачынства і  перавыхавання злачынцаў. Аналіз крымінальнага закону гаворыць аб падзеле відаў пакарання на асноўныя і дапаўняльныя, да першых з якіх належалі: штрафы на карысць пацярпеўшага і дзяржавы і іншыя маёмасныя пакаранні, турэмнае зняволенне, пазбаўленне гонару і правоў, цялесныя пакаранні, смяротная кара. Дапаўняльнымі былі: выгнанне за межы дзяржавы, пазбаўленне правоў, пакаянне. Маёмасныя пакаранні прымяняліся вельмі часта ў якасці дапаўняльных. На думку заканадаўцы, ужыванне розных відаў пакаранняў служыла не толькі мэце застрашэння, што было характэрным для перыяду феадалізма, але і выпраўлення злачынцаў, аб чым павінна было сведчыць іх чыстасардэчнае раскаянне.

Важным для крымінальнага заканадаўства XVI ст. было тое, што пры прызначэнні пакарання  Статут 1588 года патрабаваў ўлічваць усе абставіны  крымінальнай  справы, у тым ліку абцяжарваючыя і змякчаючыя віну акалічнасці, а пры адсутнасці ўпэўненасці суддзяў ў віне падсуднага – абавязваў іх схіляцца да вызвалення яго ад пакарання.

Увогуле ж крымінальны закон, як адзначаюць навукоўцы, характарызуецца параўнальна высокай для свайго часу развітасцю, шырынёй рэгламентацыі праваадносін, імкненнем да прынцыпу – «няма злачынства, якое не ўказана ў законе», тэндэнцыяй уключэння ўсяго таго новага і прагрэсіўнага, што было выпрацавана тагачаснай прававой навукай.  Менавіта таму і пазнейшы заканадаўца  пры распрацоўцы крымінальных законаў грунтаваўся на гэтых палажэннях і пераемна іх успрымаў. Так, класіфікацыя злачынстваў у статутным заканадаўстве была шмат у чым пераемна ўспрынята ў наступныя гістарычныя перыяды, аб чым сведчаць, напрыклад, крымінальныя кодэксы БССР 1922, 1928, 1960 гадоў. Напрыклад, у першы савецкі Крымінальны кодэкс 1922 года была ўведзена норма аб узросце крымінальнай адказнасці з 14 гадоў, што было

прадугледжана яшчэ Статутам 1566 года, а ў 1923 годзе – уключана ў якасці дапаўнення норма аб непрымяненні смяротнага пакарання да жанчын і інш. Пераемна былі ўспрыняты пазнейшым заканадаўствам і, зразумела, тэарэтычна больш развіты, погляды заканадаўцы на сутнасць і змест злачыннага дзеяння. Увогуле гістарычная пераемнасць праявілася ў замацаванні ў пазнейшых законах многіх важных прававых прынцыпаў, нормаў і палажэнняў

**ЛІТАРАТУРА**

1. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытных часоў да нашых дзен) / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо; пад агульн. рэд. праф. А.Ф. Вішнеўскага. – Мінск: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 320 с.

2. Доўнар, Т.І. Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV – XVI стагоддзях / Т.І. Доўнар. – Мінск: Пропилеи, 2000. – 224 с.

3. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.

4. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / Т.І. Доўнар, У.М. Сатолін, Я.А. Юхо; рэдкал. Т.І. Доўнар [і інш.]. – Мінск: Тэсей, 2003. – 352 с.